Каралевіч – Заступнік дыяцэзіі

Аўтар: Антон Шыдлоўскі
16.07.2010 03:00



4 сакавіка - свята святога Казіміра, каралевіча 25 лістапада 1993 г. папа Ян Павел II сваёй булай надаў Гродзенскай дыяцэзіі Заступнікаў. Галоўнай Заступніцай стала Вастрабрамская Божая Маці, другараднымі – св. Казімір, каралевіч і св. Максімільян Марыя Кольбэ, святар і мучанік. Святы Казімір з 1636 г. з’яўляецца галоўным Заступнікам Літвы, а з 1948 г. – асаблівым Апекуном літоўскай моладзі (гэта абвясціў папа Пій XII). Святы Казімір – адзін з гістарычных Заступнікаў Польшчы, а з 1960 г. – таксама адзін з Апекуноў Мальтыйскіх кавалераў. Ён з’яўляецца Заступнікам асоб, якія прысвяцілі сябе грамадскай службе. У Літве яго лічаць таксама Апекуном рамеснікаў. Святы Казімір – Заступнік Віленскай і Беластоцкай архідыяцэзій, Радамскай дыяцэзіі (з 1992 г.), Драгічынскай і Пінскай дыяцэзій і г. Радам (з 1983 г.).

С
вяты Казімір - другі сын караля Казіміра IV Ягелончыка - нарадзіўся 3 кастрычніка 1458 г. у Кракаве ў Вавельскім замку. “Ён быў высакародным юнаком, з рэдкімі здольнасцямі і вартага памяці розуму”, - так пісаў яго настаўнік кс. Ян Длугаш. У 1471 г. малады каралевіч выязджае ў Венгрыю, дзе яму абяцалі карону. Паход заканчваецца фіяска. Няўдалае падарожжа, падчас якога дайшло да грабяжоў, бунтаў неаплачанага рыцарства і насілля, стала вялікім перажываннем для трынаццацігадовага ўражлівага хлопца.
†

Каралевіч – Заступнік дыяцэзіі

Аўтар: Антон Шыдлоўскі
16.07.2010 03:00

